бясплодная ліцвінка і распусніца, для якой важна толькі захаваць уладу. Пісьменніца знаходзіць вельмі ўдалыя словы і сродкі, каб паказаць глыбіню і шчырасць пачуццяў і трагічнасць кахання Жыгімонта і Барбары:

І ніводнай спрэчкі,
а толькі мігаценне гэтай свечкі.
Яе задзьмухну. Сёння ноч як сажа.
Хай цемрай нашы целы звяжа [2, с. 192].

Такім чынам, у гістарычнай драме ў дзвюх дзеях "Барбара Радзівіл" Раіса Баравікова імкнулася стварыць шэраг жаночых партрэтаў славутых постацей мінулага і праз іх паказаць жаночы характар. Так, вобраз Барбары акрэсліваецца ў кантэксце праблем кахання і некахання, маральнасці і амаральнасці. У п'есе роля гэтай гераіні актыўная, яна раскрываецца праз перажыванні, унутраны свет, жаночую мудрасць і душэўную чысціню. Бона Сфорца паказана ўнутрана складанай асобай, якой таксама ўласцівы чалавечыя слабасці. У п'есе паўстаюць праблемы класічнай шэкспіраўскай драмы: свабоды і адказнасці ў прыняцці рашэнняў, выбару паміж чалавечым "я" і служэнню грамадству.

**Літаратура**


1 Каралёва, А. Жаночы і мужчынскі погляды на вобраз Барбары Радзівіл (па п'есах Р. Баравіковай і А. Дударава) / А. Каралёва // Женщина. Образование. Демократия : материалы 5-й Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 6–7 декабря 2002 г. / Жен. ин-т «Энвила» ; сост. Г. И. Шатон ; редкол. : Л. А. Черепанова [и др.]. – Минск : ЭНВИЛА, 2003. – С. 412–414.

2 Баравікова, Р. Люстэрка для самотнай : вершы, пераклады і драматычная паэма / Р. Баравікова. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 206 с.



**УДК 821.161.3-3*А.Брава**



***Т. В. Пімінёнкава***


## ЖАНОЧЫЯ ВОБРАЗЫ-АРХЕТЫПЫ І ІХ ТРАНСФАРМАЦЫІ Ў БУЙНОЙ ПРОЗЕ АЛЕНЫ БРАВА


*У артыкуле разглядаецца разнастайнасць і трансфармацыя вобразаў-архетыпаў у буйной прозе А. Брава. Прааналізаваны вобразы галоўных гераінь раманаў пісьменніцы "Садомская яблыня" і "Менада і яе сатыры" і іх суаднесенасць з вобразамі-архетыпамі антычнай міфалогіі. Зроблена выснова, што гэта сінтэтычныя вобразы, якія маюць рысы розных жаночых архетыпаў.*


Тэрмін "архетып" прапанаваў псіхолаг Карл Густаў Юнг у ХХ стагоддзі. Пад гэтым паняццем вучоны разумеў "калектыўнае бессвядомае, якое захоўвае чалавечы вопыт як рэпазіторый (англ. repository – склад, сховішча) і ў той жа час сама папярэдняя ўмова гэтага вопыту ёсць у вобразе свету, які сфармаваўся яшчэ ў спрадвечныя часы. У гэтым вобразе з цягам часу выкрышталізоўваліся пэўныя рысы, так званыя архетыпы, або дамінанты. Гэта сілы, багі, вобразы дамінуючых законаў, рэгулярна паўтаральных падзей і прынцыпы агульных заканамернасцяў, якім падпарадкоўваецца паслядоўнасць вобразаў. У той ступені, у якой гэтыя вобразы з'яўляюцца вернымі адлюстраваннямі псіхалагічных падзей, іх архетыпы, г. зн. іх асноўныя рысы, выдзеленыя ў працэсе



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

назапашвання аднастайнага вопыту, адпавядаюць пэўным характарыстыкам фізічнага свету. Архетыпічныя вобразы можна пагэтаму ўспрымаць метафарычна як інтуітыўныя паняцці фізічных з'яў. Напрыклад, уяўленні аб Эфіры, першапачатковым дыханні або душэўнай субстанцыі, якія, так бы мовіць, распаўсюджаны паўсюдна ў поглядах усіх народаў свету, і ўяўленні аб энергіі, або магічнай сіле, – інтуітыўнае ўяўленне, якое таксама мае ўсеагульнае распаўсюджанне" [1, с. 448].

Тэорыя К. Г. Юнга шырока выкарыстоўваецца ў сучасным літаратуразнаўстве. Аднак на сённяшні дзень не існуе ўніверсальнай тыпалогіі жаночых вобразаў-архетыпаў. Як у псіхалогіі, так і ў літаратуразнаўстве неаднаразова прадпрымаліся спробы разглядаць жаночыя архетыпы на падставе вобразаў міфалагічных жаночых персанажаў. Як правіла, у якасці культурнай базы выступаюць вобразы багінь старажытнагрэчаскага пантэона. У прыватнасці, Джын Болен вылучае сем жаночых архетыпаў: Дэметра, Афрадыта, Персефона, Артэміда, Афіна, Гера [2, с. 42]. У класіфікацыі Г. Бядненка да сямі тыпаў далучаецца восьмы – Геката. Характарыстыкі архетыпаў пры гэтым заканамерна абапіраюцца на сюжэты міфаў Старажытнай Грэцыі. Даследчыкі адзначаюць узроставую паслядоўнасць праяў архетыпаў у асобе жанчыны, а таксама магчымасць уплыву таго ці іншага архетыпа на на "дамінуючую мадэль паводзінаў" ("мадэль псіхікі") жанчыны, што можна трактаваць як яе паводзінскае "захрасанне" ў рамках аднаго архетыпа.

"Менада і яе сатыры" сучаснай беларускай пісьменніцы А. Брава – своеасаблівы раман-рэпартаж, які вядзе безыменная гераіня, прыкрываючыся аблічча́мі адваката, следчага, псіхіятра, журналіста, назіральніка, паталагаанатама. "Табе дазволена валодаць толькі прыгажосцю карункавых штаноў, ды і тое, калі хопіць грошай на куплю, вось і ведай сваё месца! Будзь паслухмянай дзяўчынкай, даражэнькая, і тады жыццё паставіцца да цябе паблажліва, не вытарэшчвайся на зоркі, глядзі на вітрыны з таварам, гэта трэба для тваёй жа карысці, таму што бяспечна, ідыётка!" [3, с. 58], – цытата, якая даволі ярка апісвае адну з немалаважных праблем не толькі твора, але і ў цэлым рэальнага грамадства.

Галоўная гераіня Юля – "разумная дурнічка", якая псіхалагічна залежыць ад мужчын, німфаманка, – так называе яе сама аўтарка. Дзяўчына выхавана на раманах, што моцна паэтызуюць і ўзвялічваюць каханне, надзяляючы яго звышсэнсам, дзеля якога жывуць жанчыны. Дзяўчына не здольная адрозніць, дзе рэальнасць, а дзе тое ўзнёслае, што жыве выключна на старонках кніг і прывабна афарбавана. Галоўная мэта Юлі – заваёўваць мужчын, дзякуючы чаму дасягнуць усеагульнага прызнання, атрымаць задавальненне і ганарыцца сабой, адчуць уласную паўнавартаснасць. Яна, як сапраўдная "гераіня", "мужная" дзяўчына, ідзе дзеля дасягнення жаданага на неапраўданыя ахвяры сваім целам, розумам, трывае любыя знявагі, абразы. Са сваім целам Юля далёка не на "ты". Для яе цела – гэта ўсяго толькі дзейсная зброя для прыцягнення процілеглага полу. Ці з'яўляецца гэта адмысловым кшталтам залежнасці? Безумоўна.

Назва рамана сімвалічная. Аўтарка пераасэнсоўвае вядомыя антычныя вобразы менады і сатыраў, надаючы ім новыя сэнсы. У старажытнагрэчаскай міфалогіі менады (у старажытнарымскай – вакханкі) – гэта "ап'янёныя, адурманеныя жанчыны, якія прымалі ўдзел у шалёных скоках у гонар бога Дыяніса, у рымскай міфалогіі названага Вакхам <…>. Часцей напаўаголеныя, злёгку прыкрытыя шкурамі аленяў, з распушчанымі, зблытаныміваласамі, гэтыя жанчыны пакідалі жахлівае ўражанне" [4], – зазначае Р. Котава. Лясныя боствы сатыры таксама ўваходзілі ў світу Дыяніса. Гэтыя дэманы ўрадлівасці былі вясёлымі, жыццярадаснымі істотамі з казлінымі нагамі. Гэта адчылае чытача да вакханалій – святаў распусты і оргій.

Такая назва рамана дае магчымасць чытачу больш глыбока зразумець аўтарскую пазіцыю: вобраз Юлі ўвасабляе менаду, удзельніцу розных свавольстваў, якая праз



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ахвяраванне целам разбурае ўласную душу. Пры гэтым галоўная гераіня твора – вельмі складаная асоба. У дзяўчыны быццам бы існуе свая калекцыя масак, якія яна штораз мяняе, каб адпавядаць нейкім нормам рамантычнай літаратуры: "Падумаць толькі, яна вынайшла ўнутры сябе процьму розных «я»: Незнаёмка, Менада, Пакінутае Дзіця, Дзяўчынка-Дыванок-ля-Яго ног ды яшчэ шмат іншых, у тым ліку – Параненае Сэрца..." [3, с. 38]. У вобразе Юлі праглядаецца адразу некалькі архетыпаў: менады, Геры і Персефоны, рысы кожнага з якіх праяўляюцца ў пэўных абставінах.

Цікава, што азначэнне менады суадносіцца ў творы не толькі з вобаразам Юлі, але і з іншымі жанчынамі, у тым ліку і з маці дзяўчыны. Яшчэ да таго, як Юля з'явілася на свет, яе маці выгнаў з дому п'яны бацька. Няшчасная жанчына думала, што сваім дзецям яна дасць нашмат больш, чым мела сама, і што ў яе ўсё будзе па-іншаму, чым у бацькоў. Варта згадаць: Юля нарадзілася па прычыне распуснасці яе маці, якая не шанавала сваё цела, дазваляючы карыстацца ім шматлікім мужчынам.

Вобраз закаханай жанчыны паўстае ў творы праз архетып Арыядны. Галоўная гераіня чытае свет як раман, не мае з кім падзяліцца сваімі перажываннямі і атрымаць слушную параду. Яе не вучаць, што такое дабро і зло, не вучаць адрозніваць рэалістычнае ад ілюзорнага, праўду ад хлусні. Ёй невядома, што такое поўная сям'я. Як і маці, яна будзе шукаць каханне ўсё сваё жыццё адзіным засвоеным з матчынага прыкладу і кніг спосабам. Вобраз-архетып Арыядны ў творчай інтэрпрэтацыі пісьменніцы выступае яшчэ больш пакутлівым, чым у самой антычнай гісторыі. А. Брава выкрывае крызіс мужчын, наступствамі якога з'яўляюцца крызіс сям'і і дэмаграфічны крызіс. Аднак, на нашу думку, раману "Менада і яе сатыры" бракуе развіцця гісторый мужчын, што злятаюцца на мёд гераіні Юлі.

Другі раман пісьменніцы – "Садомская яблыня" – мае складаную структуру. Твор утрымлівае і біблейскія матывы, і меладраматычныя прыкметы, і элементы рамана ў рамане разам з вершамі, і сатыру, скіраваную на выкрыццё заганаў сучаснага грамадства. Эпіграф "Руіны заўсёды прыцягвалі мяне больш, чым дамы", пазычаны пісьменніцай у Петэра Хандке, лаканічна апісвае змест усяго рамана. Руіны – гэта пра душу чалавека, пра ілюзіі магчымага шчасця, моцнай сям'і, кахання, дзе пануе ўзаемапавага, давер, цяпло. Гэта пра самарэалізацыю асобы, яе свабоду. А таксама гэта пра руіны, у якіх была знойдзена памерлая маці галоўнай гераіні Інгі Куродым – самаахвярнай, самадастатковай гераіні, у якой аб'ядналіся тры антычныя вобразы-архетыпы: Артэміды, Персефоны і Геры.

Вобраз Інгі Курыдом – галоўнай гераіні і адначасова апавядальніцы – атрымаўся вельмі рэалістычным. Інзе 42 гады, і яе жыццё не адпавядае "ідэалам" сучаснага грамадства, згодна з якімі трэба абавязкова быць замужам, пакласці ўсе сілы і сродкі на пакупку кватэры, ніякім чынам не атрымліваць асалоду ад працы, круціцца як вавёрка ў коле, каб зарабляць як мага больш грошай на жыццё, адмовіцца ад сваіх уласных поглядаў, а прытрымлівацца толькі поглядаў начальства.

Муж ад яе сышоў, калі сын Антон быў яшчэ зусім маленькім. Цяпер і само дзіця з'ехала да бацькі ў Амерыку. У Інгі зусім не засталося матывацыі, зыходзячы з якой яна б паспрабавала змяніць сваё жыццё. У жанчыны няма блізкай асобы, дзеля якой варта жыць. Гэты факт набліжае Інгу да вобраза-архетыпу Геры, якая перш за ўсё ўвасабляе моцнае жаданне быць жонкай, адчуванне фундаментальнай пустэчы ў жыцці без партнёра. Жанчына-Гера падахвочваецца "падораным багіняй" інстынктам да замужжа. Без блізкага чалавека побач яе пакуты могуць быць такімі ж глыбокімі і балючымі, як той жанчыны, якая прагне і не можа мець дзіця. Менавіта таму раман гучыць як скарга жанчыны.

У жыцці Інга прытрымліваецца вобраза ахвяры, што набліжае яе да архетыпу Персефоны. Жанчына-Персефона можа быць зусім рознай, паколькі асноўнай рысай гэтага архетыпу з'яўляецца пасіўнасць, згодлівасць, пакорлівасць, падатлівасць чужой думцы. Менавіта таму шматразова паўтораныя словы галоўнай гераіні пра тое, што яна



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

інакшая, даволі хутка надакучваюць чытачу і выклікаюць іранічную ўсмешку. Яшчэ адзін лейтматыў жыцця Інгі можна сфармуляваць наступнай фразай: “Я не хацела, так склаліся абставіны, і зараз я вельмі шкадую”.

Тым не менш Інгу можна назваць змагаром. Гэта якасць набліжае яе да вобраза-архетыпу Артэміды – архетыпу моцнай духам, мэтаскіраванай жанчыны, якая заўсёды ведае, чаго хоча і, як правіла, дамагаецца свайго (нават калі давядзецца ваяваць). Жанчыну-Артэміду характарызуе незалежнасць ад чыйго б то ні было меркавання. Аднак Артэміда настолькі ж і самотная, наколькі вольная. Яна не ўмее падтрымліваць блізкія адносіны, хоць адносіны з іншымі жанчынамі для яе важныя. Артэмідзе не хапае эмоцый і шчырых пачуццяў. Яна жыве дзеля мэты і ёй складана радавацца проста так. Ёй не хапае душэўнай успрымальнасці. Яна прымае партнёрства, але на прымальнай адлегласці. Часам можа абараняць іншага чалавека, як брата ці сястру. Так і Інга з таленавітай, прыгожай дзяўчыны ператварылася амаль у робата, які спраўна выконвае ўсе загады свайго начальства на радыё, паклаў усё сваё жыццё толькі дзеля таго, каб стаць паважаным членам грамадства, выхаваць свайго сына Антона, пабудаваць кватэру за немаленькія грошы.

Муж ад яе сышоў, калі сын Антон быў яшчэ зусім маленькім. Цяпер і само дзіця ад яе з’ехала да бацькі ў Амерыку. У Інгі зусім не засталося матывацыі, з якой яна б паспрабавала змяніць сваё жыццё, таму што ў жанчыны няма блізкай асобы, дзеля якой варта жыць. Гэты факт набліжае Інгу да вобраза-архетыпу Геры, якая, нагадаем, увасабляе найперш моцнае жаданне жанчыны быць жонкай.

Такім чынам, галоўныя гераіні абодвух раманаў А. Брава – “Менада і яе сатыры” “Садомская яблыня” – сінтэтычныя вобразы, маюць рысы розных жаночых архетыпаў. Юля яднае прыкметы менады, Геры, Арыядны і Персефоны. У вобразе Інгі аб’ядналіся тры антычныя архетыпы: Артэміды, Персефоны і Геры. Такі падыход дазваляе пісьменніцы паглыбіць псіхалагічную пераканаўчасць вобразаў гераінь і глыбока раскрыць комплекс гендарных праблем, звязаных з сацыяльнымі ролямі сучаснай жанчыны.

**Літаратура**


1 Юнг, К. Г. Психология бессознательного / Карл Густав Юнг. – Москва : «КогитоЦентр», 2010. – 352 с.

2 Болен, Дж. Богини в каждой женщине / Дж. Болен. – Москва : Амрита-Русь, 2018. – 384 с.

3 Брава, А. Рай даўно перанаселены : раман, аповесці, апавяданні / Алена Брава. – Мінск : Галіяфы, 2012. – 276 с.

4 Котова, Р. Безумные менады – это удивительное явление античной культуры [Электронный ресурс] / Р. Котова. – 2017. – Режим доступа: https://fb.ru/article/349538/bezumnyie-menadyi---eto-udivitelnoe-yavlenie-antichnoy-kulturyi. – Дата доступа: 27.11.2022.



**УДК 821.161.1-31Набоков:811.161.1′38**



***В. С. Расол***


## СТИЛИСТИЧЕСКИЕ ОСОБЕННОСТИ РОМАНА В. В. НАБОКОВА «АДА, ИЛИ РАДОСТИ СТРАСТИ»


*Статья посвящена рассмотрению основных стилистических особенностей романа «Ада, или Радости страсти» на примере ситуаций, в которых герои произведения*





РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ